УДК 94(476)

**В. А. Карпіевіч**
Універсітэт грамадзянскай абароны МНС Беларусі

# УРАДАВАЯ ПАЛІТЫКА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ПЕРЫЯД СТАНАЎЛЕННЯ ІНДУСТРЫЯЛЬНАГА ГРАМАДСТВА (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX СТ.)

Артыкул прысвечаны праблеме станаўлення індустрыяльнага грамадства на беларускіх землях у другой палове XIX ст. і палітыцы, якую праводзіў царскі ўрад на гэтых землях. Улады сваёй галоўнай апорай бачылі дваранства і праводзілі палітыку ў абарону яго інтарэсаў. Аднак на працягу XIX ст. царызм з недаверам ставіўся да мясцовых памешчыкаў, якія былі ў большасці паланізаванымі і прытрымваліся антырускай пазіцыі, што неаднаразова выяўлялася пад час паўстанняў у Заходніх губернях. Улады абмяжоўвалі дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў, земства ўзніклі тут толькі ў пачатку XX ст. Чыгуначнае будаўніцтва, а затым і ўвядзенне дыферэнцаванага тарыфу на перавозку грузаў таксама не ў поўнай меры адпавядала інтарэсам мясцовых памешчыкаў. Разглядаецца палітыка ўлады ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва. Асобна разглядаецца палітыка ўрада ў галіне адукацыі. Яна не садзейнічала развіццю сістэмы адукацыі, якая адпавядала б фармаванню буржуазнага грамадства.

**Ключавыя словы:** урадавая палітыка, індустрыяльнае грамадства, рыса аседласці, буржуазныя рэформы, адукацыя.

**Для цытавання:** Карпіевич В. А. Урадавая палітыка на беларускіх землях у перыяд станаўлення індустрыяльнага грамадства (другая палова XIX ст.) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2021. № 1 (245). С. 33–37.

**V. A. Karpiyevich**
University of Civil Protection of the Ministry
of Emergency Situations of Belarus

# GOVERNMENT POLICY IN THE BELARUSIAN LANDS DURING THE FORMATION OF INDUSTRIAL SOCIETY (THE SECOND HALF OF THE XIX CENTURY)

The article is devoted to the problem of the formation of an industrial society in the Belarusian lands in the second half of the XIX century and the policy pursued by the Government'sin these lands. The authorities saw the nobility as their main support and pursued a policy to protect its interests. Yet throughout the XIX century tsarism treated the local landowners with distrust. Most of them were polonized and supported anti-Russian sentiments. This was repeatedly demonstrated during the uprisings in the Western provinces. The authorities limited the activities of public organizations, zemstvos emerged here only at the beginning of the XX century. Railway construction, and then the introduction of a differentiated tariff for the carriage of goods, also did not fully meet the interests of local landowners. The policy of the authorities in relation to the Jewish population is considered. The Government's education policy is considered separately. It did not contribute to the development of an education system that would correspond to the formation of a bourgeois society.

**Key words:** government policy, industrial society, Pale of Settlement, bourgeois reforms, education

**For citation:** Karpiyevich V. A. Government policy in the Belarusian lands during the formation of industrial society (the second half of the XIX century). *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2021, no. 1 (245), pp. 33–37 (In Belarusian).

**Уводзіны.** У другой палове XIX ст. на беларускіх землях пачаўся працэс пераходу да індустрыяльнага грамадства. Ён ахапіў, па сутнасці, усю тэрыторыю Расійскай імперыі ў першую чаргу дзякуючы буржуазным рэформам, якія адбыліся ў імперыі пасля адмены прыгону. Чакалася, што дзякуючы гэтым рэформам краіна стане на колы буржуазнага развіцця, пачнуцца значныя змены ў жыцці грамадства, а вялікая колькасць вызваленых ад прыгону працоўных рук будзе накіравана на развіццё прамысловасці. Тым не менш працэс станаўлення індустрыяльнага грамадства будзе адбывацца не аднолькава ў розных рэгіёнах Расійскай імперыі. Свае асаблівасці былі і на землях. Працэс грамадскай мадэрнізацыі адбываўся тут інакш, чым у другіх рэгіёнах Еўрапейская Расіі. І для гэтага былі свае прычыны. Адной з асаблівасцей беларускіх зямель у XIX – пачатку XX ст. стала тое, што тут быў

даволі стракаты склад насельніцтва. Значная частка памешчыкаў і шляхты былі паланізаванымі і прылічвалі сябе да польскай нацыі. Частка сельскага і гарадскога насельніцтва былі католікамі, іх таксама імкнуліся залічваць у палякі. На гэтай тэрыторыі жыла шмат яўрэйскага насельніцтва. За паўстагоддзе пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі сюды стала перасяляцца даволі шмат рускіх, асабліва чыноўнікаў і святароў, а таксама вайскоўцаў. Усё гэта накладвала свой прыкметны адбітак на сацыяльна-эканамічныя і палітычныя працэсы беларускіх зямель у XIX – пачатку XX ст.

**Асноўная частка.** У перыяд правядзення ў імперыі буржуазных рэформ (60–70-я гг. XIX ст.) беларускія землі аказаліся ў складаным палітычным становішчы. Паўстанне 1863–1864 гг. прадэманстравала царскім уладам, што не ўсё мясцовае насельніцтва прыхільна ставіцца да імперыі. Значная частка мясцовай шляхты і памешчыкаў па-ранейшаму маюць сепаратысцкі настрой і жадаюць аднаўлення Рэчы Паспалітай. І яны ў сваіх жаданнях знаходзяць падтрымку ў часткі насельніцтва беларускіх зямель. Таму ўрад, баючыся прапольскага ўплыву ў органах грамадскага кіравання, а таксама праз сістэму навучання праводзіць на беларускіх землях буржуазныя пераўтварэнні з вялікай асцярогай. Нежаданне царскіх улад праводзіць на гэтых землях паўнавартасныя пераўтварэнні прывяло да таго, што працэс стварэння на беларускіх землях інстытутаў буржуазнага грамадства будзе адбывацца марудна, са значным адставаннем ад іншых рэгіёнаў Еўрапейская Расіі, дзе, адзначым, улады таксама не будуць імкнуцца ствараць гэтыя інстытуцыі ў поўным аб'ёме.

Пасля падаўлення паўстання на чале з К. Каліноўскім у беларускіх губернях дзейнічала забарона на стварэнне рознага роду аб'яднанняў і таварыстваў, нават тых, якія мелі мэту аказання дапамогі сельскагаспадарчым вытворцам. І толькі ў канцы 70-х гг. XIX ст. урад даў дазвол стварыць на Беларусі таварыствы сельскіх гаспадароў, дзейнасць якіх была абмежавана толькі аграрнай сферай. Аднак і гэтыя таварыствы знаходзіліся пад пільным кантролем улад. Недавер з боку царызму да мясцовых памешчыкаў і шляхты, значная частка якіх прылічвала сябе да польскай нацыі, знайшоў свій выраз у адмове ад правядзення на беларускіх землях земскай рэформы 1864 г. Улады баяліся, што праз земствы польскія элементы зноў пачнуць агітаваць насельніцтва да паўстання, таму яны ў беларускіх губернях з'явіліся толькі ў пачатку XX ст.

Асаблівая палітыка царызму ў заходніх губернях назіралася і ў дачыненні да яўрэйскага насельніцтва. Яшчэ Кацярынай II у 1791 г. была вызначана рыса яўрэйскай аселасці, у якую ўвайшлі і беларускія губерні. Існаванне дадзенай рысы вызначыла нацыянальны склад мясцовага насельніцтва. Менавіта тут была даволі высокая канцэнтрацыя яўрэйскага насельніцтва, якое пражывала не толькі ў гарадах, але і ў мястэчках ды вёсках. Многія з іх набывалі зямлю ці бралі яе ў арэнду ў мясцовых памешчыкаў. У сваю чаргу асобыя адносіны да яўрэйскага насельніцтва аказалі ўплыў і на правядзенне гарадской рэформы 1870 г. царскія ўлады не жадалі, каб у органах гарадскога самакіравання дамінавалі прадстаўнікі яўрэйскага насельніцтва, а яны ў большасці беларускіх гарадоў і мястэчак складалі звыш 50% жыхароў. Органы гарадскога самакіравання ў беларускіх губернях былі створаны толькі праз 5 гадоў.

У 1882 г. царскі ўрад выдаў новы ўказ, паводле якога яўрэям забаранялася сяліцца па-за гарадамі і мястэчкамі, а таксама арандаваць або набываць зямлю. Пэўныя абмежаванні былі і ў арэндзе нерухомай маёмасці. Таксама яўрэям забаранялася гандляваць віном у нядзелю і царкоўныя святы [1, с. 181].

Перанаселенасць гарадоў і мястэчак Беларусі яўрэямі прывяла да таго, што многія з іх былі вымушаны займацца прамысловай дзейнасцю ці гандлем. Гэта вызначыла нацыянальны склад гандлёвага саслоўя ў Беларусі, пераважная большасць якога была яўрэямі. Яны таксама складалі і пераважную большасць гільдзейскага купецтва. Іх адносная колькасць сярод купцоў 1-й і 2-й гільдыі складала ад 80 да 90% і больш. Так, у 1868 г. з 85 купцоў 1-й гільдыі ў 5 губернях 69 былі яўрэі [2, с. 762–764]. Згодна з перапісам 1897 г., да купецкага саслоўя ў Беларусі адносілася 12 045 чалавек, з іх – 10 536 (або 87,5%) – яўрэі. Тое, што амаль увесь гандаль у губернях знаходзіўся ў руках яўрэяў, неаднаразова адзначалі ў сваіх справаздачах і губернатары.

З мэтай узмацнення купецкага саслоўя ўрад правёў у 1863 г. гільдзейскую рэформу. Згодна з новым палажэннем скасоўвалася 3-я гільдыя. Нанава вызначаліся правы і абавязкі гільдзейскіх купцоў. За купецкае пасведчанне 1-й гільдыі збіралася паўсюды адна і тая ж пошліна. Яна была ўстаноўлена ў памеры 265 руб. [3, отдел II, с. 5]. У той жа час гэтае пасведчанне давала права займацца аптовым гандлем рускім і замежным таварам па ўсёй імперыі, а таксама займацца ў тых месцах, дзе яны набылі пасведчанні, рознічным гандлем і трымаць там прамысловыя прадпрыемствы [4, отдел I, с. 162].

Кошт пасведчання купца 1-й гільдыі быў даволі высокім, таму ў гэты перыяд колькасць купцоў гэтай гільдыі ў беларускіх губернях была невялікай. Доля пасведчанняў 1-й гільдыі ад-

носна агульнага ліку гадавых дакументаў на гандаль вагалася ў другой палове 60-х гг. XIX ст. ад 0,1% у беларускіх паветах Віцебскай губерні да 0,3% у Магілёўскай, а ў беларускіх паветах Віленскай губерні не было выкуплена ніводнага. І толькі ў канцы XIX ст. доля пасведчанняў 1-й гільдыі складала ад 0,2% у Віленскай губерні да 0,6% у Магілёўскай [5, с. 69].

Тое, што царскія ўлады не ўлічвалі асаблівасцей сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх зямель, знайшло сваё адлюстраванне і пад час будаўніцтва чыгунак. Чыгуначныя лініі пракладваліся згодна стратэгічным планам урада, часта яны праводзіліся ў баку ад важных гандлёвых цэнтраў, якія, як напрыклад Шклоў, паступова страчвалі сваё значэнне. Пры гэтым улады ігнаравалі і звароты мясцовых памешчыкаў з прашэннямі аб будаўніцтве новых чыунак. Так, у 1862 г. яны пакінулі без увагі просьбу памешчыкаў Валынскай, Мінскай, Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губерняў аб будаўніцтве чыгункі ад Беластока праз Пружаны да Пінска і далей да Валыні [6, л. 1].

Чыгункі аказалі значны ўплыў на развіццё гандлёвай дзейнасці. Раней перавоз грузаў залежаў ад рэк і стану дарог. Цяпер шмат грузаў магло перавозіцца хутка і ў вялікай колькасці. Аднак не ва ўсіх была магчымасць выкарыстоўваць чыгуначныя перавозкі ў поўнай меры. Асабліва гэта закранула сельгасвытворцаў беларускіх губерняў.

Сведчаннем таму, што царскі ўрад не бачыў памешчыкаў заходніх губерняў сваёй надзейнай апорай, было ўвядзенне дыферэнцаванага чыгуначнага тарыфу. Дадзеная палітыка праводзілася выключна ў інтарэсах памешчыкаў-зерневытворцаў цэнтральных расійскій губерняў. Згодна з гэтым тарыфам было больш выгадна адпраўляць хлеб па чыгунках за мяжу, чым перавозіць для продажу ў межах губерняў. Так, перавоз грузу на адлегласць 567 км каштаваў 6,1 кап. за пуд. У той жа час перавоз такога ж грузу на адлегласць да 300 км каштаваў 7,46 кап. за пуд [7, с. 202]. Выкарыстанне дадзенага тарыфу прывяло да таго, што рынак Беларусі быў запоўнены танным хлебам з расійскіх губерняў. Так, напрыклад, жыта, прывезенае ў заходнія губерні з Тулы на адлегласць у 1650–1750 вёрст, абыходзілася пры перавозцы ў 50,02 кап. за пуд, а мясцовае пры перавозцы на адлегласць да 150 вёрстаў – 58,51 кап. за пуд [8, с. 43]. І толькі пасля шматлікіх зваротаў мясцовых памешчыкаў і прадстаўнікоў улад чыгуначны тарыф быў паменшаны. У 1893 г. быў паніжаны тарыф для грузаперавозак на адлегласць да 320 вёрст, а ў 1896 г. дадзеная льгота была распаўсюджана да 450 вёрст [9, с. 90–92, 181–186].

Немалаважнае значэнне для развіцця эканомікі мелі фінансавыя ўстановы. Фактычна да канца 60-х гг. XIX ст. у Беларусі не існавала ніводнай крэдытнай установы. Беларускія губернатары неаднаразова звярталі ў сваіх справаздачах увагу на тое, што мясцовы крэдыт развіты тут вельмі слаба і не можа задавальняць патрэбы насельніцтва. Першай мясцовай крэдытнай установай у Беларусі стаў Гомельскі гарадскі банк, які пачаў сваю дзейнасць у 1870 г. Услед за ім у 1873 г. быў заснаваны Мінскі камерцыйны банк.

Усяго напрыканцы XIX ст. у Беларусі дзейнічала 26 банкаўскіх устаноў. Сярод іх, акрамя ўжо названых, былі 7 таварыстваў узаемнага крэдыту, а з 1897 г. у г. Мінску стала працаваць гарадское крэдытнае таварыства.

Акрамя банкаў, у Беларусі дзейнічалі розныя банкірскія канторы і дамы. Напрыканцы 1890-х гг. буйных кантор налічвалася: у Мінскай і Магілёўскай губернях – па 7, Гродзенскай – 11, Віцебскай – 4. У Ашмянскім павеце Віленскай губерні дзейнічала адна кантора [10, с. 163]. Іх пазыкамі актыўна карысталіся дробныя і сярэднія гандляры, для якіх крэдыт у камерцыйных банках быў недасягальны.

На працягу 1881–1884 гг. свае аддзяленні ва ўсіх губернскіх гарадах Беларусі адчыніў Дзяржаўны банк. Купцы першапачаткова неахвотна карысталіся яго паслугамі. Так, у 1883 г. Мінскае аддзяленне Дзяржбанка выдала крэдытаў 18 купцам, якія займаліся продажам сельскагаспадарчай прадукцыі. А на 1 студзеня 1890 г. тут атрымаў крэдыт 51 купец. На працягу 90-х гг. XIX ст. дзейнасць аддзяленняў Дзяржбанка ў заходніх губернях узрасла. У 1898 г. 5 яго аддзяленняў выдалі 465 крэдытаў на гандаль сельгаставарамі ў памеры 1,9 млн руб. У сярэднім кошт аднаго крэдыту ў Беларусі складаў каля 5,5 тыс. руб. [10, с. 162]. Наогул дзейнасць у Беларусі аддзяленняў Дзяржбанка была даволі паспяховай. Па падліках Н. Л. Яснапольскага, Дзяржбанк меў больш даўгоў перад сваімі беларускімі аддзяленнямі, чым яны перад банкам. У 1888 г. даўгі Дзяржбанка перад 4 беларускімі аддзяленнямі склалі 1682 тыс. руб., у 1890 г. – 531 тыс. руб., а ў 1893 г. – ужо 2803 тыс. руб. [11, дадат. да табл. 55]. Гэта сведчыць аб тым, што Дзяржбанк выкачваў сродкі з беларускіх губерняў.

Своеасаблівая палітыка царскіх улад назіралася і ў галіне народнай асветы. У пачатку XIX ст. усё навучанне на беларускіх землях вялося на польскай мове. Але пасля паўстання 1830–1831 гг. улады перагледзелі сваю палітыку ў гэтай справе. У 1832 г. быў зачынены Віленскі ўніверсітэт. Таксама польская мова была забаронена для выкарыстання ў навучальным працэсе, згодна з указам 1836 г., ва ўсіх

навучальных установах забаранялася выкарыстанне і выкладанне польскай мовы, а мовай навучання абіралася руская [12, с. 426].

Буржуазныя рэформы 60-х гг. XIX ст. закранулі і сістэму адукацыі. У 1864 г. было зацверджана Палажэнне аб пачатковых народных вучылішчах і Статут гімназій і прагімназій. Народныя вучылішчы ўтрымліваліся за кошт казны, у іх маглі вучыцца прадстаўнікі ўсіх саслоўяў. У сваю чаргу гімназіі падзяляліся на класічныя і рэальныя. Аднак толькі пасля заканчэння класічнай гімназіі можна было далей працягваць навучанне ва ўніверсітэце. У 1871 г. прымаецца новы Статут гімназій, згодна з якім усе рэальныя гімназіі ператвараюцца ў класічныя. Аднак ужо ў 80-я гг. XIX ст. пачынаецца адыход ад буржуазных рэформ, у тым ліку і ў галіне адукацыі. У 1884 г. было прынята палажэнне аб царкоўнапрыходскіх школах, згодна з якім народныя пачатковыя школы зачыняліся. На іх месцы ствараліся царкоўнапрыходскія, якія падпарадкоўваліся сіноду і мясцоваму духавенству. Да 1889 г. такіх школ дзейнічала на тэрыторыі Беларусі амаль 6 тыс. А ў 1887 г. адбываецца скасаванне прагрэсіўных працэсаў у адукацыйнай сістэме. У гэтым годзе Міністэрства народнай асветы прыняла цыркуляр, згодна з якім уводзілася абмежаванне па прыёму ў навучальныя ўстановы дзяцей ніжніх саслоўяў.

У 1868 г. у Беларусі дзейнічала 18 сярэдніх навучальных устаноў, 10 мужчынскіх і жаночых гімназій, 2 прагімназіі, 4 духоўныя семінарыі і земляробскія вучылішчы, а таксама Полацкі кадэцкі корпус. Да 1899 г. тут з’явіліся яшчэ толькі дзве новыя сярэднія навучальныя ўстановы. Колькасць навучэнцаў у іх павялічылася за гэты перыяд з 3 да 5 тыс. чалавек.

Аднак вышэйшых навучальных устаноў на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX ст. не існавала. Адзіная з такіх устаноў, Горыцкі земляробчы інстытут, заснаваны ў мястэчку Горкі Магілёўскай губерні ў 1839 г. як земляробчая школа, а затым ператвораная ў 1848 г. у вышэйшую навучальную ўстанову, была зачынена пасля паўстання 1863–1864 гг.

Такім чынам, палітыка царскіх улад на беларускіх землях у галіне адукацыі не адпавядала патрэбам індустрыяльнага грамадства, якое толькі фармавалася. Развіццё фабрык і заводаў патрабавала новыя працоўныя кадры, якія б мелі не толькі пачатковую адукацыю, але і нават агульную сярэднюю, не гаворачы ўжо пра прафесійную і вышэйшую. Нежаданне адчыняць навучальныя ўстановы, якія задавальняюць патрэбы індустрыяльнага развіцця, не садзейнічала хуткаму капіталістычнаму развіццю беларускіх зямель. Згодна з перапісам насельніцтва 1897 г., пісьменныя складалі ў Мінскай губерні толькі 17,8% ад усяго насельніцтва (сярод гарадскога – 45,2%), у Магілёўскай – 16,% (сярод гарадскога – 45,3%), у беларускіх паветах Віцебскай – каля 16% (сярод гарадскога – каля 40%), Гродзенскай – каля 20% (сярод гарадскога – каля 50%), Віленскай – каля 25% (сярод гарадскога – каля 45%) [13, с. 23–25].

**Заключэнне**. Такім чынам, можна вызначыць, што палітыка царскіх улад на Беларусі была неадназначнай. З аднаго боку, царызм не бачыў мясцовае насельніцтва, у тым ліку і памешчыкаў, сваёй надзейнай апорай у краі. Гэта праяўлялася ў абмежаваннях пры стварэнні рознага роду таварыстваў ці аб’яднанняў, з другога – улады вымушаны былі праводзіць значныя пераўтварэнні, якія ў пэўнай ступені павінны былі б садзейнічаць развіццю Беларусі. Аднак царызм у першую чаргу абараняў інтарэсы памешчыкаў. Гэтаму ў значнай ступені адпавядалі абмежаванні купляць зямлю за межамі гарадоў Беларусі прадстаўнікам іншых саслоўяў і іншаземцам. Акрамя таго, царскія ўлады не рабілі спецыяльных захадаў па развіцці прамысловасці ў беларускіх губернях. Аднак яны і не перашкаджалі развіццю пэўных галін прамысловасці. У асноўным прамысловыя прадпрыемствы Беларусі былі звязаны з перапрацоўкай мясцовай сыравіны.

Улады не звярталі асабістай увагі і на пашырэнне адукацыі на беларускіх землях, стрымлівалі ўсе намаганні ў гэтым накірунку, што не магло не аказаць негатыўны ўплыў на фармаванне мясцовай інтэлігенцыі. Але станаўленне індустрыяльнага грамадства патрабавала павышэння яго адукацыйнага і культурнага ўзроўню.

## Спіс літаратуры

1. Полное собрание законов Российской империи (ПСЗРИ). Собр. 3: в 48 т. СПб.: Гос. тип., 1882. Т. 2. 1139 с.

2. Адрес-календарь Виленского генерал-губернаторства на 1868 г. / сост. А. Сементовский. Вильна: Тип. К. Вульфа, 1868. 246 с.

3. ПСЗРИ. Собр. 2. СПб.: Тип. 2 отд-ния Е. И. В. Канцелярии, 1866. Т. 38. 941 с.

4. ПСЗРИ. Собр. 2. СПб.: Тип. 2 отде-ния Е. И. В. Канцелярии, 1867. Т. 40. 991 с.

5. Карпіевіч В. А. Развіццё гандлю ў Беларусі (1861–1900): дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / В. А. Карпіевіч; Бел. дзярж. пед. ун-т. Мінск, 2003. 138 с.

6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1458.

7. Экономика Белоруссии в эпоху империализма. 1900–1917 / под ред. Г. Т. Ковалевского [и др.]. Минск: Академия наук БССР, 1963. 420 с.

8. Кожушков А. И. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии во второй половине XIX в. Минск: Изд-во М-ва высш., сред. спец. и проф. образования БССР, 1963. 87 с.

9. Китанина Т. М. Хлебная торговля России в 1875–1914 гг.: Очерки правительственной политики / под ред. С. И. Потолева. Л.: Наука, 1978. 287 с.

10. Бейлькин Х. Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии. 1861–1914. Минск: Наука и техника, 1989. 288 с.

11. Приложение к исследованию Н. П. Яснопольского «О географическом распределении государственных доходов и расходов в России». Киев: Тип. ун-та Св. Владимира, 1897. 119 с.

12. Очерки истории школы и педагогической мысли народов СССР. XVIII– первая половина XIX в. / отв. ред. М. Ф. Шабаева. М.: Педагогика, 1973. 608 с.

13. Документы и материалы по истории Белоруссии: в 3 т. Минск: Академия наук БССР, Ин-т истории, 1953. Т. 3: 1900–1917 гг. 1020 с.

## References

1. *Polnoye sobraniye zakonov Rossiyskoy imperii (PSZRI)* [Complete Collection of Laws of the Russian Empire (CCLRE)]. St. Petersburg, Gos. tip. Publ., 1882, vol. 2. 1139 p.

2. Sementovskiy A. *Adres-kalendar' Vilenskogo general-gubernatorstva na 1868 g.* [Address calendar of the Vilnius Governor General for 1868]. Vil'na, Tip. K. Vul'fa Publ., 1868. 246 p.

3. *PSZRI* [CCLRE]. St. Petersburg, Tip. 2 branches of H. I. M. the Chancellery, 1866, vol. 38. 941 p.

4. *PSZRI* [CCLRE]. St. Petersburg, Tip. 2 branches of H. I. M. the Chancellery, 1867, vol. 40. 991 p.

5. Karpievich V. A. *Razvitstse gandlyu u Belarusi (1861–1900). Dis. kand. gist. navuk* [Development of trade in Belarus (1861–1900). Kand. Diss]. Minsk, 2003. 138 p.

6. National historical archive of belarus. Fund 295. I. 1. F. 1458.

7. Kovalevskiy G. T. *Ekonomika Belorussii v epokhu imperializma. 1900–1917* [The economy of Belarus in the era of imperialism. 1900–1917]. Minsk, Akademiya nauk BSSR Publ., 1963. 420 p.

8. Kozhushkov A. I. *Razvitiye kapitalizma v sel'skom khozyaystve Belorussii vo vtoroy polovine XIX v.* [The development of capitalism in the agriculture of Belarus in the second half of the nineteenth century]. Minsk, Izd-vo Ministerstva vysshego, srednego spetsial'nogo i professional'nogo obrazovaniya BSSR Publ., 1963. 87 p.

9. Kitanina T. M. *Khlebnaya torgovlya Rossii v 1875–1914 gg.: Ocherki pravitel'stvennoy politiki* [Grain trade in Russia in 1875–1914: Essays on government Policy]. Leningrad, Nauka Publ., 1978. 287 p.

10. Beyl'kin Kh. Yu. *Sel'skokhozyaystvennyy rynok Belorussii. 1861–1914* [Agricultural market of Belarus. 1861–1914]. Minsk, Nauka i tekhnika Publ., 1989. 288 p.

11. *Prilozheniye k issledovaniyu N. P. Yasnopol'skogo "O geograficheskom raspredelenii gosudarstvenny'kh dokhodov i raskhodov v Rossii"* [Appendix to the study by N. P. Yasnopolsky "On the geographical distribution of state revenues and expenses in Russia"]. Kiev, Tip. un-ta Sv. Vladimira Publ., 1897. 119 p.

12. Shabayeva M. F. *Ocherki istorii shkoly i pedagogicheskoy mysli narodov SSSR. XVIII – pervaya polovina XIX v.* [Essays on the history of school and pedagogical thought of the peoples of the USSR. XVIII– the first half of the XIX century]. Moscow, Pedagogika Publ., 1973. 608 p.

13. *Dokumenty i materialy po istorii Belorussii* [Documents and materials on the history of Belarus]. Minsk, Akademiya nauk BSSR, Institut istorii Publ., 1953, vol. 3: 1900–1917. 1020 p.

## Інфармацыя пра аўтара

**Карпіевіч Віктар Аляксандравіч** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гуманітарных навук. Універсітэт грамадзянскай абароны МНС Беларусі (220118, г. Мінск, вул. Машынабудаўнікоў, 25, Рэспубліка Беларусь). E-mail: karpievich68@yandex.by

## Information about the author

**Karpiyevich Viktar Aliyaksandravich** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of Humanities. University of Civil Protection of the Ministry of Emergency Situations of Belarus (25, Mashinostroiteley str., 220118, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: karpievich68@yandex.by

*Паступіў 05.03.2021*